Аляксандр Смолік

доктар культуралогіі, прафесар,
загадчык кафедры культуралогіі факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (г. Мінск, Беларусь)

# Memory studies у творчай спадчыне Івана Кандрацьева

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ



Спецыфічнай формай духоўнай свядомасці народа, формай мастацтва слова з'яўляецца літаратура. М. М. Бахцін у працы «Эстетика словесного творчества» падкрэсліваў, што «Литература — неотрывная часть культуры, ее нельзя понять вне целостного контекста всей культуры данной эпохи» [3, *329*]. З гэтага выказвання філосафа вынікае больш глыбокае і праблемнае меркаванне аб тым, што літаратура не замыкаецца ў сваім гістарычным часе, а сэнс літаратурнага твора выходзіць за межы сваёй эпохі. Вялікія творы літаратуры, па меркаванні Ю. Крысцевай, падрыхтоўваюцца стагоддзямі, а ў эпоху іх стварэння здымаюцца толькі спелыя плады працяглага і складанага працэсу выспявання [9, *13*]. Літаратура выяўляе і ўвасабляе ў мастацкіх вобразах усю разнастайнасць чалавечага быцця, грамадскую свядомасць часу, багацце чалавечых характараў і тыпаў.

Важкі ўнёсак у развіццё беларускай і рускай літаратуры зрабіў Іван Казіміравіч (Кузьміч) Кандрацьеў, які нарадзіўся 9 (21) ліпеня 1849 г. у с. Каловічы Вілейскага павета Віленскай губерні. Яго творчая дзейнасць пачынаецца ў 1868 г., калі ў «Віленскім весніку» быў апублікаваны першы верш «Вільня 22-га кастрычніка 1868 г.» Пазней там жа надрукаваны вершы «Прачысценская царква», «Вільня», «З кожным годам у краі нашым…», «19 лютага», «З натуры» і інш. Спрабуе сябе Іван Кандрацьеў у якасці драма-

турга. Піша вадэвіль «Валасны пісар, альбо дзе хвост пачатак, там галава мачала», які быў апублікаваны ў Вільні асобым выданнем. У «Весніку…» былі апублікаваны яшчэ два «драматычныя жарты» — «Сцэнка на Віленскай таўкучцы» і «Гандаль у мястэчках Паўночна-Заходняга краю». У 1872 г. пачынаючы драматург удзельнічае ва Усерасійскім конкурсе на лепшую п’есу для народных тэатраў. Па выніках конкурсу яго гістарычная драма «На Паволжы» была прызнана лепшай, а яе аўтару быў прысуджаны Вялікі залаты медаль. У гэтым жа годзе І. К. Кандрацьеў пераязджае ў Маскву, дзе пачынаецца зорны час пісьменніка з народа. Ён з галавой акунаецца ў літаратурнае жыццё першапрастольнай. Працуе адначасова ў некалькіх рэдакцыях часопісаў і газет, выконваючы абавязкі сакратара. Паралельна працуе ў трупе народнага тэатра А. Ф. Фядотава на Політэхнічнай выстаўцы, але пасля яго закрыцця ў 1872 г. займаецца толькі літаратурнай дзейнасцю. Ён становіцца актыўным удзельнікам літаратурна-музычнага гуртка, які стварыў Іван Сурыкаў для пісьменнікаў-самавучак з народа. Паэтычныя творы І. К. Кандрацьева склалі два зборнікі «Думы и были» (1884) і «Под шум дубрав» (1897). Паэтам створаны таксама больш буйныя паэтычныя творы. Яго сучаснікі пазітыўна адгукнуліся на паэмы «Полтавская певунья» і «Альманзор», «Правда матушка». Ім напісаны добра вядомыя і любімыя народамі Беларусі і Расіі песні: «По диким степям Забайкалья», «Чудо-гусли», «Сила песни», «Свирель», «То песни родины моей…», «Достался жребий мне святой…», «Черноброва краса Дуся…» і інш. У маскоўскі перыяд ім створана значная колькасць драматычных твораў: п’есы «Разлучница», «Легко отделался», «Березовая гать», аднаактных п’ес-«жартаў» «Воевода Волчий Хвост», «На Плющихе», «Ради копеечки» і інш. З-пад яго пяра выйшаў шэраг шырока вядомых да нашага часу гістарычных раманаў: «Гуны», «Драма на Лубянцы», «Раскольнічыя гнёзды», «Салтычыха». Апошні твор перавыдаваўся 5 разоў!



Адным са змястоўна-тэматычных вузлоў творчасці пісьменніка была праблема культурнай памяці. Мнеманічная аксіялогія культуры літаральна пранізвае кандрацьеўскія тэксты. Дарэчы, канцэптуальныя палажэнні (memory studies) пачалі распрацоўвацца ў заходнееўрапейскай гуманітарыстыцы толькі ў 20—30-я гг. ХХ ст. Так, французскі сацыёлаг М. Хальбвакс у 1920—1930-я гг. прысвяціў праблемам культурнай памяці шэраг прац і ўвёў у навуковы ўжытак паняцце «калектыўная памяць» [14, *297*]. Аналіз празаічных і паэтычных твораў І. Кандрацьева сведчыць: ён інтуітыўна вызначыў, што культурная памяць уключае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў сябе сацыяльнае несвядомае (этнічную псіхалогію, архетыпы, сацыяльныя інстынкты) і культурную спадчыну, якая падраздзяляецца на неапрадмечаную (духоўную спадчыну) і апрадмечаную частку — матэрыяльную культуру. У другой палове мінулага стагоддзя тэхналагічныя і функцыянальныя сэнсы артэфактаў, якія па анталагічным статусе ўяўляюць сабой формы памяці, даследавалі Т. Адорна [1], Ю. Лотман [11], Дж. Нероне [17], П. Рыкёр [13] і інш. Па іх меркаванні культура памяці ўяўляе сабой комплекс сродкаў і механізмаў, якія забяспечваюць мнемічную дзейнасць соцыуму, якая дазваляе выяўляць, апрацоўваць, зберагаць сацыяльныя сэнсы, перадаваемыя з мінулага ў цяперашняе ў выніку актаў культурна-гістарычнай камунікацыі. Паводле Я. Асмана, культурная памяць гэта — спецыфічная для кожнай культуры форма перадачы і актуалізацыі культурных сэнсаў, якія накіроўваюць учынкі і перажыванні ў спецыфічныя рамкі ўзаемадзеяння ўнутры пэўнага грамадства і падлягаюць настаўленню і паўтарэнню з пакалення ў пакаленне [2, *86*]. П. Бёрк сцвярджае, што культурная памяць уключае ў сябе абгрунтаваныя ўспаміны, якія сцвярджаюць законнае і апраўданае існаванне парадку сацыяльных з’яў [15, *108*]. І. Ірвін-Зарэцка падкрэслівае, што для стварэння, захавання, трансляцыі культурнай памяці ў грамадстве павінны існаваць спецыяльныя інстытуты і рытуалы [16]. Яна мае сакральную афарбоўку, ёй уласцівы прыўзнятасць над узроўнем паўсядзённасці. С. Кройтар разглядае «культурную памяць як механізм узнаўлення сацыяльных практык» [10, *97*].



Адным са стымулюючых пачаткаў у актыўнай распрацоўцы Кандрацьевым тэмы культурнай памяці стала асэнсаванне мінулага ў кантэксце духоўнага крызісу, на мяжы стагоддзяў. Чым можна растлумачыць кандрацьеўскую цікавасць да гістарычнай раманістыкі? Івана Кузьміча заўсёды цікавіла мінулае. Асабліва тое, што адыйшло ад нас у глыбіню вякоў, мала пакінула яўных слядоў далёкага чалавечага жыцця. Пісьменнік увесь вольны ад літаратурнай працы час аддаваў вывучэнню пісьмовых гістарычных крыніц. Сведчаннем таму грунтоўныя аб’ёмныя працы па гісторыі Маскоўскага крамля, гісторыі Масквы і яе навакольных населеных пунктаў. Збор матэрыялаў для абазначаных выданняў далі яму масу ўражанняў, паслужылі крыніцай, асновай для гістарычных твораў. У памяці людзей заставаліся яскравыя ўспаміны аб Айчыннай вайне 1812 г., руска-турэцкай вайне 1856—1863 гг., паўстанні на Беларусі і Літве 1863—1864 гг. Назіраемая, ахопліваемая розумам рэчаіснасць адкладвалася ў памяці, дзе спела шмат тэм і сюжэтаў, каб праз пэўны час увасобіцца ў вобразах навелістычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і раманных аповедаў. Спрыяла цікавасці да гістарычнай тэматыкі і даволі актыўная гістарычная думка, якая фарміравалася ў XIX ст. у Расіі. У гэты час існаваў грунтоўны кірунак беларускіх і рускіх гісторыкаў і літаратараў, якія лічылі сэнсам сваёй дзейнасці ўзвышэнне сваёй нацыі, узвядзенне ўласна славянскай гісторыі да глыбокай старажытнасці. З гэтай мэтай са старажытнасці імі адбіраліся выключна неабходныя, кампліментарныя для нацыянальнай самасвядомасці факты. У вытокаў гэтага кірунку былі такія вядомыя рускія гісторыкі і пісьменнікі як П. В. Баброўскі, М. І. Балінскі, І. І. Грыгаровіч, М. В. Доўнар-Запольскі, Ю. І. Крашэўскі, І. Лялявель, Т. Я. Нарбут, Ю. І. Вянелін, А. Ф. Вельтман, Д. І. Ілавайскі і інш. Безумоўна, Іван Кузьміч, які жыва цікавіўся гісторыяй, чытаў іх працы, падпаў пад іх уплыў. Зыходзячы з карамзінскіх тэзісаў аб неабходнасці вывучэння мінулага, наш зямляк прыйшоў да высновы аб тым, што лепшай формай, з дапамогай якой магчыма азнаёміць народ з яго гісторыяй, з'яўляецца форма гістарычнага рамана. Зварот да гістарычнага жанру, на наш погляд, тлумачыцца імкненнем пісьменніка быць карысным сваёй творчасцю народу. Гістарызм кандрацьеўскай мастацкай думкі адчуваецца ўжо ў гістарычнай драме «Быль на Волге», якая пабачыла свет у 1875 г., дзе адлюстраваны падзеі сялянскага паўстання пад кіраўніцтвам С. Разіна.

Першы гістарычны раман вялікага памеру «Гуны» І. Кандрацьеў апублікаваў у 1887 г., дзе паставіў мэту не толькі стварыць у рамане гарманічную карціну духоўнага яднання правадыра і яго супляменнікаў, што дазваляла готам, а пазней і венедам (гунам) шматкратна памножыць іх дынамічныя памкненні. У рамане, які складаецца з трох частак, праступае аўтарскі погляд на гісторыю як на калектыўную памяць народа і арэну яго барацьбы за свабоду супраць прыгнятальнікаў. «Мы погибнем, но дети наши славяне создадут великое царство и будут великим народом. Прольем же для детей наших кровь свою, дабы они польстились нашим примером и не забыли нас» [4, *3*].

Важнейшым крытэрыям, накіроўваючым арыенцірам, якіх прытрымліваецца І. Кандрацьеў на працягу сваіх гістарычных раманаў, выступаюць сацыяльныя рэаліі, псіхалагічныя дэталі, побытавыя дробязі ўзнаўляемай эпохі. Дакладнасць іх апісання становіцца нормай аповеду. Так, калі Балемір выбірае сабе шчыт, то пісьменнік не забывае, што ён зроблены з дубу, на якім даволі груба выразана дубовая галінка і па выразаным месцы расфарбавана ярка-зялёнай фарбай [4, *38*].

Сюжэт рамана «Гуны» зададзены гісторыяй і геаграфіяй заваявацельных паходаў готаў, гунаў. Пісьменнік дакладна вызначае межы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржавы караля Эрманрыка, якая займала прастору ад берагоў Дона і ўсю Паўночную Еўропу. Венеды (славяне) рассяліліся на Балтыйскім узбярэжжы, па Віслe, Паўночнай Дзвіне, Нёмане [4, 7]. І. Кандрацьеў імкнецца прытрымліватца дакладна ўстаноўленых фактаў, дат, падзей, якія зафіксаваны ў пісьмовых крыніцах. З гэтай мэтай у мастацкі тэкст ён уводзіць звесткі вядомых еўрапейскіх і расійскіх гісторыкаў. Для вызначэння гісторыі старажытнага Кіева, які называе сталіцай гунаў, творца прыцягвае працы Саксона Граматыка, Адама Брэменскага, Гельмгольда, І. Я. Забеліна, П. Й. Шафарыка, Д. І. Ілавайскага і інш. У асобных выпадках празаік абапіраецца на паўночныя казанні і сагі.

У кандрацьеўскіх раманах створана цэлая галерэя мастацкіх вобразаў, якія рэальна дзейнічалі ў розныя гістарычныя эпохі. У «Гунах» — гэта Аціла, Атанарык, Балемір, Будлі, Эрманрык і інш. Аналіз тэксту разглядаемага твора дае ўсе падставы сцвярджаць, што пісьменніку ўдалося стварыць жывую, як бы сапраўдную, трохмерную карціну. Выбраныя для паказу сцэны раманаў падаюцца выпукла, каларытна, прыгожа. Падзеі, якія разгортваюцца ў празаічных творах, адбываюцца на спрадвечных беларускіх землях, у Панямонні. Тут, па меркаванні аўтара, у старажытныя часы рассяліліся славяне-венеды, якіх пазней заваявалі готы. Час ад часу венеды ўздымалі паўстанні, якія жорстка падаўляліся готамі. Пасля задушэння аднаго з такіх паўстанняў венеды вырашаюць перасяліцца на іншыя тэрыторыі, што ўвайшло ў сусветную гісторыю як вялікае перасяленне народаў. У творчай спадчыне І. Кандрацьева шырока выкарыстоўваецца канцэпт вайны як акт памяці. Тэрмін «канцэпт» у культуралогіі разумеецца як змест паняцця, яго сэнсавае напаўненне ў абстрагаванні ад канкрэтна-маўленчай формы выказвання. У адрозненні ад паняцця, якое суб'ектыўнае па сваёй сутнасці, канцэпт можа адлюстроўваць суб'ектыўны погляд на тую ці іншую праблему. У кандрацьеўскай трактоўцы канцэпт вайны з'яўляецца прадметам эмоцый, сімпатый і антыпатый, ён мысліцца, перажываецца. Канцэпт вайны раскрываецца І. Кандрацьевым як з пазіцый універсальнага, так з пазіцый і нацыянальнага. Вайна як памяць пра мінулае ажывае ў рамане «Вялікі разгром» [6], гістарычнай аповесці «Божае знаменне» [7], у якіх творца паказвае ўсё расійскае грамадства зверху да нізу, адносіны розных сацыяльных груп да драматычнага эпізода ў айчыннай гісторыі. Асноўнай жанравай формай разглядаемых твораў з'яўляецца, як і ў старажытным эпасе, вялікая гістарычная падзея, ад зыходу якой залежыць лёс многіх народаў. Але ў адрозненне ад гераічнага эпасу ў рамане і аповесці ўзнаўляюцца лёсы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асобных людзей, лёс асобы, чалавека. Кандрацьеў не паказвае малюнкі вялікіх бітваў пад Клясціцамі, Полацкам, Смаленскам, пры Бярэзіне. Сцісла апісвае ён бітвы пад Віцебскам і Барадзіно. Уся ўвага пісьменніка сканцэнтравана на выяўленні чалавечай, маральна-псіхалагічнай сутнасці ўдзельнікаў вайны.

У рамане і асабліва ў аповесці І. Кандрацьевым створана галерэя вобразаў герояў Айчыннай вайны. Выразнікам патрыятычнага духу і маральнай сілы расійскай арміі выступае М. І. Кутузаў. У аповесці асобны раздзел адведзены трактоўцы вобраза, які дапаўняецца асобнымі дэталямі, раскінутымі па ўсім тэксце разглядаемых твораў. Пісьменнікам створаны таксама мастацкія вобразы П. Баграціёна, Барклая де Толі, Ф. Растапчына, Напалеона Банапарта. Яны розныя. Так, імператар Францыі паказаны як нахабны і жорсткі захопнік, дзеянні якога не толькі не апраўданы ні гісторыяй, ні патрэбнасцямі французскага народа, але супярэчаць маральнаму ідэалу чалавецтва. Напалеон паўстае як суб'ект супрацьлеглага дэманічнага свету, антыпод Боскага тварэння. Ён — дзёрзкі парушальнік законаў гісторыі, індывід, які пагарджае ўсім, не прызнае нічога, акрамя сваёй волі: «Человека этого сделала мировым гением грубость, неразборчивость и посредственность, которыми он обладал в более высокой степени, чем грубость, неразборчивость и посредственность» [7, *14—15*].

Такім чынам, у рамане і аповесці чытачу адкрываюцца малавядомыя старонкі 200-гадовай гісторыі перадаў Айчыннай вайны 1812 г., тагачаснага побыту. У аповесці большасць падзей адбываецца на тэрыторыі сучаснай Беларусі, што набывае для нас асаблівую каштоўнасць. У гэтым выступае этнанацыянальны кантэкст Айчыннай вайны 1812 г., які адлюстроўвае рэаліі ходу вайны ў канкрэтным рэгіёне і асэнсаванне яе суб'ектамі пэўнай культуры. Франка-расійская вайна ўзрушыла жыццё не толькі рускага, але і беларускага народаў, актывізавала грамадска-палітычны рух на Беларусі. Аднаўленне Напалеонам на тэрыторыі Польшчы герцагства Варшаўскага беларуская шляхта разглядала як пачатак вызвалення ад расійскай залежнасці ўсіх тэрыторый, уключаных у склад Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай. Антырасійскія дзеянні шляхты і каталіцкага духавенства падтрымлівала і частка беларускага сялянства.

У 1893 г. ім завершана праца над унушальнай па памеры кнігай «Седая старина Москвы», якую яе аўтар называе гістарычным аглядам і поўным паказальнікам маскоўскіх «достопамятностей» [6, 5]. Фаліянт, аб'ём якога раўняўся амаль 800 старонкам, быў падараваны імператару



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мікалаю II, за што выдавец Іван Андрэевіч Марозаў 10 мая 1894 г. «...через заведующего делами Августейших Детей Их Императорских Величеств, генерал-лейтенанта Васильчикова, был осчастливлен получением благодарности» [5, *193*]. Дадзены фаліянт — вынік упартай працы ў архівах, прачытання невядомых нам крыніц, якія захоўваюцца ў цэрквах, манастырах, рознага роду ведамствах. Пры складанні гістарычнага даведніка І. К. Кандрацьеў выкарыстоўваў друкаваныя мемумары і даследаванні аб Маскве сваіх папярэднікаў. У тэксце разглядаемай працы маюцца спасылкі на Ніканаўскі і Наўгародскі летапісы, «Гісторыю дзяржавы Расійскай» М. Карамзіна, «Степенную книгу», сачыненні І. Забеліна, А. Ратшына, І. Снягірова, артыкулы протаіерэя Мікалая Скварцова, святара М. Салаўёва і інш. Падчас працы над даведнікам І. Кандрацьеў сабраў вялікае мноства дакументаў, выяў, пісьмовай і вуснай інфармацыі, змясціць якую немагчыма было ў аналізуемым даведніку. Матэрыялы, якія не ўвайшлі ў кнігу «Седая старина Москвы», паслужылі асновай асобнай кнігі «Московский Кремль», якая была апублікавана ў 1890 г. І. Кандрацьеў сабраў і сістэматызаваў велізарнейшы матэрыял аб звыш 1000 вядомых і невядомых маскоўскіх гісторыка-культурных помніках. Напісаная лёгка і займальна, яна з'яўляецца для масквічоў і іх гасцей цудоўным даведнікам па Маскве, каштоўнай крыніцай гістарычных ведаў. «Если чадо аристократов и буржуа, — піша сучасны расійскі навуковец Г. Е. Міронаў, — обучавшиеся истории отечества в классических гимназиях или дома у гувернеров, читал Кондрацьева для души, наслаждаясь его образной речью, то другие россияне получали из его книг зачастую первую, а то и единственную информацию об истории страны, "достопамятностях" Москвы» [10, *5*].

Выдадзеная кніга «Седая старина Москвы» 120 гадоў таму назад і да гэтага часу з'яўляецца каштоўным выданнем па старой Маскве і, само сабой разумеецца, вялікай бібліяграфічнай рэдкасцю. Час ад часу яна перавыдаецца. Толькі за апошнія шэсць гадоў кніга перавыдавалася тры разы значнымі тыражамі (1996, 2006, 2008), што сведчыць аб вялікай цікавасці сучаснікаў да яе. Прывабнасць кандрацьеўскай кнігі для сённяшняга чытача, на наш погляд, у тым, што яе аўтар аб'ектыўна, грунтоўна, надзвычай уніклява, у дэталях апісвае гісторыю ўзнікнення, будаўніцтва расійскай сталіцы. І. Кандрацьеў дае вельмі цэльныя характарыстыкі праўлення тых ці іншых цароў, адзначаючы ролю кожнага ў стварэнні дзяржавы Расійскай навогул і Масквы ў прыватнасці. Ён праяўляе сябе і як гістарычны публіцыст, у адрозненні ад І. М. Снягі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рова, І. Я. Забеліна, Іван Кузьміч дазваляе сабе ў строгі і канкрэтны аповед уключыць эмацыянальныя публіцыстычныя адхіленні: аб прыгажосці маскоўскіх будынкаў, аб таленце дойлідаў, аб значэнні для Русі тых ці іншых рашэнняў, якія прымаліся маскоўскімі самадзержцамі. Будучы бліскучым стылістам, І. Кандрацьеў змог падабраць добрае і нераўнадушнае слова для кожнага збудавання, падзеі, звычая, рытуалу.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. *Адорно, Т.* Что значит «проработка прошлого»? / Т. Адорно // Неприкосновенный запас. — 2005. — № 2—3. — С. 36—45.
2. *Асман, Я.* Культурная память. Письмо, память о прошлом и политическая идентичность в высоких культурах древности / Я. Асман. — М., 2004. — 217 с.
3. *Бахтин, М. М.* Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин. — М. : Искусство, 1979. — 423 с.
4. *Кондратьев, И. К.* Гунны. Эпоха великого переселения народов : ист. роман из жизни славян IV-го и V-го столетий / И. К. Кондратьев. — М. : Тип. Э. Лиснер и Ю. Роман, 1878. — 184 с.
5. Кондратьев, И. К. Московский Кремль. Святыни и достопамятности : историческое описание соборов, церквей и монастырей / И. К. Кондратьев. — Собств. дом, 1890. — 193 с.
6. *Кондратьев, И. К.* Великий разгром / И. К. Кондратьев. — М. : Тип. Э. Лиснер и Ю., 1887. — 150 с.
7. *Кондратьев, И. К.* Божье знамение : повесть / И. К. Кондратьев. — М. : Профиздат ; Товарищество «Возрождение», 1992. — 85 с.
8. *Кондратьев, И. К.* Седая старина Москвы / И. К. Кондратьев. — М. : АСТ, Хранитель, 2008. — 764 с.
9. *Кристева, Ю.* Разрушение поэтики / Ю. Кристева // М. М. Бахтин : pro et contra. Творчество и наследие М. М. Бахтина в контексте мировой литературы. — Т. II. — СПб. : РХГИ, 2002. — 712 с. — С. 15.
10. *Кройтор, С. Н.* Культурная память как механизм воспроизводства социальных практик / С. Н. Кройтор // Социологический альманах. — 2010. — Вып. 1. — С. 97—105.
11. *Лотман, Ю. М.* Память в культурологическом измерении / Ю. М. Лотман // Избранные статьи. — Таллин, 1992. — Т. 1. — С. 200—202.
12. *Миронов, Г. Е.* Старая Москва — далекая Москва / Г. Е. Миронов // И. К. Кондратьев. Седая старина Москвы. — М. : Воениздат, 1996. — 764 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. *Рикёр, П.* Память, история, забвение / П. Рикёр. — М. : Изд-во гуманитар. лит., 2004. — 725 с.

14. *Хальбвакс, М.* Социальные рамки памяти / пер. с фр. и вступ. ст. : С. Зенкин / М. Хальбвакс. — М. : Новое издательство, 2007. — 547 с.

15. *Burke, P.* History as social memory / P. Burke // Memory, History and the Mind / Butler T. (ed). — Oxford, New York : Basil Blackwell, 1989. — 421 p.

16. Jrwin — Zarecka Iwona. Frames of Remembrance : The dynamics of Collective Memory. — New Brunswick (USA), London (UK) : Transaction Publishers, 2008. — 397 p.

17. *Nerone, J.* Professional History and Social Memory / J. Nerone // Communication. — 1989. — № 11. — P. 89—104.

Таццяна Мармыш

магістр культуралогіі, супрацоўнік аддзела навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Інстытута культуры Беларусі (г. Мінск, Беларусь)



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Нематэрыяльныя «месцы памяці» ў структуры лакальнай ідэнтыфікацыйнай сістэмы супольнасці

«Глабальнае» і «лакальнае» — фактары ідэнтычнасці, што праяўляюцца ў кампліментарным суіснаванні тэндэнцыі да сусветнай інтэграцыі і ўніфікацыі жыццёвых форм і імкненні да захавання і развіцця этнакультурных адрозненняў, ростам лакальнай гетэрагеннасці і лакальных феноменаў быцця, — акрэсліваюць праблему лакальнай ідэнтычнасці ў сучаснай сацыякультурнай прасторы.

Лакальная ідэнтычнасць знаходзіцца ў аснове складанай іерархічнай структуры прасторава-тэрытарыяльнай ідэнтычнасці і адпавядае фацыяльнаму аспекту грамадскай свядомасці (жыхар «малой радзімы»), выяўленаму ў шэрагу з краінавым (жыхар краіны), адміністрацыйным (жыхар суб'екта адміні-